# ГРАМАДЗЯНСКАЯ АДУКАЦЫЯ НА АСНОВЕ РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ДЭМАКРАТЫІ

Правы чалавека з'яўляюцца істотнай крыніцай натхнення для грамадскіх навучальных праграм. Яны ўплываюць на ўвядзенне новага зместу, на будаванне прасторы, каб выпрабабаваць прымяненне правоў, свабод і абавязкаў чалавека і грамадзяніна ў практыцы. Ўніверсальнасць правоў дапамагае педагогам знайсці прыклады рэальных сітуацый выкарыстання або парушэння правоў, якія абараняюцца міжнароднымі прававымі дакументамі.

Я хачу прадэманстраваць права чалавека на веды, з якога вынікае права доступу да публічнай інфармацыі, даступнасць яе атрымання і распаўсюджвання, забарона дыскрымінацыі па розных пэўных галінах, свабода выказвання меркаванняў, супрацьстаянне карупцыі (палітычнай, дзяржаўнай і прыватнай).

Істотным увагі з'яўляецца той факт, што школа функцыянуе як першая публічная прастора, у якой моладзь дзейнічае, таксама яна з'яўляецца публічнай установай, у якой маладыя людзі свядома сутыкаюцца з правам і ў якой маюць пэўныя правы і абавязкі. Менавіта тут маладая асоба атрымлівае досвед адміністрацыйнай публічнай працы, яе службовай ролі на карысць грамадзяніна. Гэты першы досвед вельмі моцна ўплывае на фарміраванне грамадскіх пастацей дзяцей і моладзі і таксама на іх погляды ў іх пазнейшым працоўным, сацыяльным і сямейным жыцці. Істотнасць уплыву школы на вучня падкрэслівае Эўрапейская Карта Ўдзельніцтва Моладзі ў Лакальным і Рэгіянальным Жыцці.

Эўрапейская Карта Ўдзельніцтва Моладзі ў Лакальным і Рэгіянальным Жыцці была прынятая Пастаяннай Канферэнцыяй Эўрапейскіх Рэгіянальных Улад і Рэгіянальнай Радай Эўропы ў 1992 годзе, была яшчэ раз разгледжана ў 2003 годзе, падкрэслівае істотнасць адукацыі ў правах чалавека, грамадзянскага выхавання ў школе, першага досведу кантактаў з публічнай адміністрацыяй вучня ў школе і таксама істотнасць нефармальная адукацыі. У гэтым дакуменце надаецца вялікая ўвага доступу да інфармацыі ў адукацыі моладзі. Інфармацыя трактуецца як ключавая для ўдзелу, і права моладзі на доступ да інфармацыі на тэму магчымасцей і істотных для іх справаў можна знайсці ў афіцыйных эўрапейскіх і міжнародных дакумэнтах. Удзел моладзі ў лакальным і рэгіянальным жыцці пачынаецца ў школе. У школе моладзь пазнае правы чалавека і грамадзяніна. Таксама павінны быць шанцы на іх выпрабаванне, практыку ўдзелу, пазнанне значэння словаў- партысыпацыя, добрая парада, справаздача, узаемаадказнасць, сацыяльная актыўнасць, самакіраванне. Клубы зацікаўленасцей, тэматычныя сэкцыі, якія даюць магчымасць не толькі для рэалізацыя вучнёўскіх зацікаўленняў, але і для прыняцця на сябе адказнасці за функцыянаванне клубу.

Роляй настаўніка, школы на падставе прынцыпаў Карты з'яўляецца заангажаванне



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

моладзі ва ўдзельніцтве ў сацыяльных акцыях, цыклічным валантэрстве і абароне іх супольных мэтаў, поглядаў, постацей, з якімі яны сябе ідэнтыфікуюць.

Права на публічную інфармацыю і яе рэалізацыю вынікае з арт. 10 Эўрапейскай Канвенцыі Правоў Чалавека і Падставовых Свабод з 1950 году, з'яўляецца асновай для эфектыўнай дзейнасці дэмакратычнай краіны і для дэмакратызацыі партысыпацыі, якая знаходзіцца на стадыі развіцця. Дазваляе грамадзянам рэалізоўваць іх публічныя правы. Роляй настаўніка з'яўляецца паказанне прыкладаў з рэчаіснасці, прымяненне ў практыцы права да ведаў, адным з такіх прыкладаў з'яўляецца права на доступ да публічнай інфармацыі, што азначае нашмат больш, чым доступ да дакумэнтаў.

ШТО АЗНАЧАЕ ПРАВА НА ПУБЛІЧНУЮ ІНФАРМАЦЫЮ ДЛЯ МОЛАДЗІ?

Дае магчымасць для супольнай дзейнасці з уладамі школы пры выкананні публічнах заданняў, супольнага прымання рашэнняў у абшары мэтаў фінансаваня публічных фундацый, дае мачымасць для грамадзянскай актыўнасці.

Карыстаючыся правам доступу да публічнай інфармацыі, моладзь можа кантраляваць уладу. Спраўджваць ці тое, што робяць кіраўнікі згаджаецца з правам, ці прынятыя рашэнні аб'ектыўныя і выкананыя на падставе прынятых працэдур, напрыклад, на якія выдаткі пайшлі прызначаныя публічныя грошы. Гэты дазвол мае анімацыйнае дзеянне на моладзь і на кіруючых асобаў, якія мусяць памятаць, што кожнаму грамадзяніну без указвання падстаў належыць права на атрыманне інфармацыі аб тым, што публічная адміністрацыя (урад і самаўрад), а ў выпадку вучняў, дырэкцыя школы, робіць, выкарыстоўваючы публічныя сродкі.

Права на публічную інфармацыю дае кожнаму ўдзельніку нелалежна ад узросту права на веды, і гэтае права апіраецца на прынцыпы празрыстай дзейнасці публічнай адміністрацыі, у тым ліку як дзяржаўнай так і прыватнай школы, якая карыстаецца сродкамі з публічных установаў, рэалізуе публічныя заданні.

У школе моладзь прыглядаецца, атрымлівае досвед прынцыпаў адчыненасці, даступнасці, роўнасці шанцаў. Істотным з'яўляецца тое, каб у школе моладзь магла папрактыкаваць хаця б магчымасць задавання пытанняў, удзел ў працэсе прыняцця рашэнняў, якія іх датычацца і якія спалучаныя з дзейнасцю школы, і магчымасць правядзення дэмакратычных працэсаў, такіх як выбары прадстаўнікоў моладзі падчас выбарчай кампаніі. Узаемнае прыняццё рашэнняў аб выдатках школы дазволіць моладзі паверыць у моц грамадзянскіх правоў і дазволіць атрымаць досвед узаемаадказнасці за рашэнні, прынятыя ў школе.

З дапамогай рухаючай моцы супольнага грамадзянскага кантролю можна папрактыкаваць з моладдзю выкарыстанне права на публічную інфармацыю шляхам задавання пытанняў мясцовым уладам і дырэкцыі школы.

Дзякуючы гэтаму, моладзь атрымае досвед сацыяльнай партысыпацыі, далучыцца да



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

развіцця прынцыпу добрага кіравання і ўзгаданай справаздачы ўлады. Істотным з'яўляецца тое, каб моладзь запомніла, што задаваць пытанні і атрымоўваць на іх адказы мае права кожны, незалежна ад узросту. Гэта азначае, што форма грамадзянскай актыўнасці датычыцца ўсіх у адрозненні ад актыўных і пасіўных выбарчых правоў, якія залежаць ад узросту. Задаваючы пытанне, мы не абавязаныя тлумачыць прычыны "Навошта нам гэтая інфармацыя",кім мы з'яўляемся, а таксма мы не павінны захоўваць пісьмовыя фармальнасці ў гэтай справе. Можна проста адправіць е-мейл на адрас установы або іншай гаспадарчай інстытуцыі грамадзянкай уласнаці і чакаць адказу.

Права на інфармацыю з'яўляецца інструментам кантролі грамадства і служыць між іншым супрацьдзеянню з'явы карупцыі.

Justice Initiative стварыла падчас шырокіх дыскусій шэраг правілаў, якім павінна адпавядаць права на інфармацыю. Польскае права прытрымліваецца практычна ўсіх стандартаў (bez pkt.10), якія абмяркоўваюцца паўсюль.

Правілы (стандарты):

1.Права на інфармацыю з'яўляецца правам кожнага.

2.Адчыненасць з'яўляецца прынцыпам, а таямніца выключэннем.

3.Прадстаўляць інфармацыю абавязаны ўсе публічныя ўстановы.

4.Працэдуры павінны быць хуткімі, бесплатнымі і лёгкімі.

5. Кіраўнікі павінны дапамагаць тым, хто падае заяўкі ў пошуку доступу да інфармацыі

6. Адмова мусць быць патлумачаная.

7. Публічная зацікаўленасць павінна заўсёды займаць першае месца ў адрозненні ад таямніцы.

8. Магчымасць адмовы ад негатыўнага рашэння з'яўляецца абавязковай.

9. Публічныя ўстановы павінны актыўна распаўсюджваць інфармацыю.

10.Права на інфармацыю ахоўваецца незалежнай установай.

Наколькі права на доступ да публічнай інфармацыі датычыцца адміністрацыйнай публічнай дзейнасці і апекуноў сродкаў ад публічнага імя, настолькі даступнасць інфармацыі вынікае з таго самага прынцыпу Канвенцыі і аб'ядноўвае магчымасць азнакамлення з інфармацыяй кожнай асобы без тэхнічнага, моўнага абмежавання ці сацыяльнага статусу.

## КАГО ДАТЫЧЫЦЦА ДАСТУПНАСЦЬ ІНФАРМАЦЫІ

Праблематыка даступнасці да інфармацыі і электронных дакумэнтаў датычыцца кожнай асобы, якая шукае інфармацыю, карыстаецца сваімі правамі і свабодамі ў акрэсе ад права да ведаў, інфармацыяй і яе далейшым распаўсюджваннем. Праектуючы старонку WWW, трэба задбаць аб тым, каб яе змесцы былі даступныя для як мага большай колькасці асобаў без звяртання ўвагі на абсталяванне, праграмаванне, узрост



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматы Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

ці інваліднасць. Шырока папулярызаваная стандарызацыя старонак WWW дазваляе пазбягаць праектавання некалькіх версіяў, якія згаджаюцца з рознымі пашукавікамі і мабільнымі версіямі (standardy WCAG 2.0). Таксма знікае праблема дапасавання старонкі да яе прагляду асобам з інваліднасцю, якія карыстаюцца рознымі прыладамі.

Даступнасць інфармацыі залежыць ад павелічэння лічбы адрэсатаў рэкламы, што прыводзіць да здабычы прыбылі фірмамі ці змены пазыцыі ў арганізацыях non-profit і not-for-profit. У тым месцы варта падкрэсліць, што Інтэрнэт адрэсаваны для ўсіх, і для інвалідаў з рознымі тыпамі дысфукнцыяў, працэнт якіх можна акрэсліць як od 8% do 10% ад насельніцтва. Між іншым гэта датычыцца:

- сляпых асобаў, асобаў,якія дрэнна бачаць і асобаў якія маюць праблему з распазнаваннем колераў.
- асобаў, якія карыстаюцца праграмамі, якія агучваюць голасам змест старонак у інтэрнэце (screenreadery).
- асобаў з фізічнай інваліднасцю, якія карыстаюцца кампутарам з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў, якія распазнаюць рухі вочнага яблыка, абслугоўваюць кампутар з дапамогай вуснаў або толькі з дапамогай клавіатуры.
- глухіх асобаў або асобаў, якія дрэнна чуюць
- асобаў з інтэлектуальнай інваліднасцю, якія могуць мець праблему з засваеннем інфармацыі (квестыя аблягчэння камунікацыі). Даступнасць інфармацыі датычыцца ў роўнай ступені цыфрова выключаных асобаў (e - wykluczenie), у сталым узросце (50+), асобаў з нізкай або іншым чынам сфарміраванай адукацыяй, замежнікаў і таксама асобаў, якія карыстаюцца з мабільных або іншых пашукавікоў. Наступнымі групамі асобаў з'яўляюцца тыя, хто карыстаецца старым абсталяваннем або павольным інтэрнэтам і асбобы, якія карыстаюцца ультрасучаснымі тэхналогіямі, напрыклад, iPadami.

  У сувязі з прыманнем права доступу да інфармацыі ў якасці рэчаіснасці, былі апрацаваныя кіруючыя прынцыпы даступнасці, якія супрацьстаяць розным групавым зацікаўленасцям. Прытрымліванне такіх прынцыпаў дае магчымасць для поўнай рэалізацыі правоў чалавека на веды. Запрапанаваныя прынцыпы даступнасці інфармацыі змяшчаюць агульныя мерныя крытэрыі поспеху, вымаганыя і рэкамендаваныя тэхнікі і прыклады памылак, якія паўстаюць часцей.

## ЧАМУ ВАРТА ЗАЙМАЦЦА ПРАБЛЕМАТЫКАЙ ДАСТУПНАСЦІ ІНФАРМАЦЫІ?

Праблематыка дасупасці інфармацыі датычыцца ўсіх. Кожны з нас несвядома ламае бар'еры дасупнасці, якіях датычацца між іншым недастатковага памеру шрыфта, аб'ёму анімацыі, маляўнічых фонаў, дрэннага кантрасту, міргання элементаў (blinking) або ўспышкі (flash), адсутнасці субтытраў ў аўдыё-відэа ці парадаў наконт таго, дзе мы



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

ў цяперашні час знаходзімся на вэб-старонцы.
Асоба, якая пакутуе ад электроннага выключэння дадае да гэтага адсутнасць навыкаў у выкарыстанні клавіятуры або мышы, страх перад новымі тэхналогіямі і памылкамі, ці, хутчэй, іх незваротнасцю. Людзі з абмежаванымі магчымасцямі маюць няздольнасць чуць гутарку, успрымаць візуалізацыю, здымкі, якія складаюць аснову інфармацыі ў сеціве (без выкарыстання праграмы чытання з экрана і іншых тэхналогій), абмежаваны доступ да зместу вэб-старонкі або да сістэмы перадачы дадзеных з-за іх фармату (змест у форме малюнку дакумента, код CAPTHA)

Праблема даступнасці электроннай інфармацыі з'яўляецца не толькі абавязкам права, але і ў роўнай ступені абавязкам рэалізацыі патрэбаў грамадства і карысці ад пашырэння грона адрасатаў- тых, хто ўспрымае інфармацыю, апублікаваную ў сеціве. Даступнасць інфармацыі з'яўляецца адным з гарантаваных Канстытуцыяй і міжнароднымі рэгуляцыямі правоў чалавека. Усе абмежаванні даступнасці інфармацыі з'яўляюцца абмежаваннямі свабоды правоў, і тым самым нараджаецца сацыяльная няроўнасць, якую сучаснае грамадства не можа прыняць.

ГРАМАДЗЯНСКАЯ АДУКАЦЫЯ

1. Аблягчае справу станаўлення грамадзянінам, салідарнасці сярод моладзі, пазнавання і разумення істотнасці значэння і супольнага адчування каштоўнасцей талерантнасці, супрацьстаяння ўсялякім формам дыскрымінацыі, выключэння з грамадства, а ў тым і е-выключэння;
2. Усведамляе правы, свабоды і абавязкі чалавека і грамадзяніна;
3. Фарміруе пастаці развіцця, актыўнага ўдзельніцтва;
4. Вучыць узаемаадказнасці, стратэгія WIN - WIN;
5. Усведамляе каштоўнасці і прынцыпы дэмакратычнага працэсу ў дзейнасці;
6. Усведамляе match, рознабаковасць грамадства- эканамічныя, грамадскія, культурныя і з рознаўзроўневыя сацыяльныя інтэграцыі- лакальнае грамадства, нацыянальнае і глабальнае.

**Выпіска з міжнародных дакументаў, якія выкарыстоўваліся падчас прэзентацыі.**

I. КАРТА ПАДСТАВОВЫХ ПРАВОЎ ЭЎРАЗВЯЗУ
II. КАНВЕНЦЫЯ АБ АХОВЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І ПАДСТАВОВЫХ СВАБОД
III. КАНВЕНЦЫЯ АБ'ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ (ААН) СУПРАЦЬ КАРУПЦЫІ
IV. КАНВЕНЦЫЯ ААН ПА ПРАВАХ ІНВАЛІДАЎ

КАРТА ПАДСТАВОВЫХ ПРАВОЎ ЭЎРАЗВЯЗУ (2010/C 83/02)
абвешчаная на самеце ЭЗ у Ніццы ў снежні 2000

Артыкул 11 Свабода пераказваць інфармацыю
1. Кожны мае права на свабоду выказвання. Гэтае права аб'ядноўвае свабоду пасядання поглядаў, атрымання і пераказвання інфармацыі і ідэі без інтэграцыі і без звяртання ўвагі на дзяржаўныя межы.
2. Шануе свабоду і плюралізм медыяў.

Артыкул 12 Свабода ствараць арганізацыі і сходы
1.Кожны мае права на свабоду мірных сходаў і на свабоду аб'яднання на ўсіх узроўнях, у прыватнасці ў палітычным, прафсаюзным і грамадскім жыцці, з якога вынікае права кожнага чалавека ствараць і ўступаць у прафесійныя саюзы для абароны сваіх інтарэсаў.
2. Палітычныя партыі на ўзроўні Эўразвязу садзейнічаюць выражанню палітычнай волі грамадзян.

Артыкул 42 Права доступу да дакумэнтаў
Кожны грамадзянін Эўразвязу і любая фізічная або юрыдычная асоба, якая мае месца пражываня або зарэгістраваны офіс у дзяржаве-ўдзельніку, мае права доступу да дакументаў установаў, органаў і арганізацыйных установаў, незалежна ад іх формы.

КАНВЕНЦЫЯ АБ АБАРОНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І АСНОЎНЫХ СВАБОД , АБВЕШЧАНАЯ 4 ЛІСТАПАДА 1950 ГОДУ
Артыкул 3 Забарона катаванняў
Ніхто не павінен падвяргацца ні катаванням, ні бесчалавечнаму або зневажальнаму годнасць звароту або пакаранню.

Артыкул 10 Свабода выказвання меркаванняў
1.Кожны мае права на свабоду выказвання меркавання. Гэта права ўключае свабоду мець сваё меркаванне і свабоду атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі без якога-небудзь ўмяшальніцтва з боку публічных уладаў і незалежна ад дзяржаўных межаў. Гэты прынцып не перашкаджае дзяржавам ажыццяўляць працэдуру ліцэнзавання радыёвяшчальных , тэлевізійных ці



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

кінематаграфічных прадпрыемстваў.

**2.**2 .Карыстанне з гэтых свабод з'яўляеццца вынікам накладання абавязкаў і адказнасці і можа быць звязаным з пэўнымі фармальнасцямі , умовамі , абмежаваннямі або санкцыямі , якія прадугледжаны законам і неабходныя ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі , тэрытарыяльнай цэласнасці або грамадскага парадку, у мэтах прадухілення беспарадкаў або злачынстваў , для аховы здароўя і маральнасці , абароны рэпутацыі або правоў іншых асоб , прадухілення выдавання інфармацыі , атрыманай канфідэнцыйным шляхам , або для падтрымання аўтарытэту і бесстароннасці правасуддзя.

Артыкул 11 Свабода сходаў і аб'яднанняў

1.Кожны чалавек мае права на свабоду мірных сходаў і на свабоду аб'яднанняў, якое ўключае права ствараць і ўступаць у прафсаюзы для абароны сваіх інтарэсаў.

2 .Выкананне гэтых правоў не можа падлягаць іншым абмежаванням, акрамя тых, якія прадугледжаны законам і з'яўляюцца неабходнымі ў дэмакратычным грамадстве ў інтарэсах нацыянальнай бяспекі або грамадскага спакою, у мэтах прадухілення беспарадкаў або злачынстваў, для аховы здароўя і маралі або абароны правоў і свабодаў іншых асобаў. Гэта палажэнне не перашкаджае ўвядзенню законных абмежаванняў на ажыццяўленне гэтых правоў асобамі, якія ўваходзяць у склад узброеных сіл, паліцыі або дзяржаўнай адміністрацыі.

Артыкул 14 Забарона дыскрымінацыі

Карыстанне правамі і свабодамі, прызнанымі ў гэтай Канвенцыі, павінна быць забяспечаным без якой-небудзь дыскрымінацыі па прыкмеце полу, расы, колеру скуры, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, прыналежнасці да нацыянальных меншасцяў, маёмаснага становішча, нараджэння ці па любой іншай прычыне.

КАНВЕНЦЫЯ ААН СУПРАЦЬ КАРУПЦЫІ - 09.12.2004 ГОДУ

Артыкул 13 Удзел грамадства

1. Кожная Дзяржава-Удзельніца прымае адпаведныя меры, дзейнічаючы ў межах сваіх магчымасцяў і ў адпаведнасці з падставовымі прынцыпамі свайго ўнутранага заканадаўства, для спрыяння актыўнаму ўдзелу асобных людзей і груп за межамі публічнага сектару, у тым ліку грамадзянскай супольнасці, няўрадавых і прыродаахоўных арганізацый у галіне папярэджання і барацьбы з карупцыяй і павышэння дасведчанасці грамадства ў дачыненні існавання, прычын і цяжару пагрозы, якая зыходзіць ад карупцыі. Гэта ўдзел варта ўмацоўваць з дапамогай такіх мер, як:

(а) павелічэнне празрыстасці і садзейнічанне ўдзелу грамадства ў працэсе прыняцця рашэнняў;

(б) **забеспячэнне для насельніцтва эфектыўнага доступу да інфармацыі**,



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

(в) правядзенне мерапрыемстваў па інфармаванні, якія павялічваюць неталерантнасць да карупцыі, а таксама праграмаў публічнай адукацыі , у тым ліку школьных і універсітэцкіх праграмаў;
(г) павага, заахвочванне і абарона свабоды пошуку, атрымання, апублікавання і распаўсюджвання інфармацыі аб карупцыі. Тое, што свабода можа быць спалучана з некаторымі абмежаваннямі, але гэта можа быць толькі ў адпаведнасці з законам і паставіць у тым акрэсе, неабходным:
(i) для павагі правоў і рэпутацыі іншых асобаў;
(ii) для аховы дзяржаўнай бяспекі, грамадскага парадку, здароўя або маральнасці насельніцтва.
2.Кожная Дзяржава-удзельніца прымае належныя меры для забеспячэння таго, каб кампетэнтныя органы па барацьбе з карупцыяй, названай у дадзенай Канвенцыі, былі вядомыя грамадству, каб забяспечыць доступ да гэтых органаў з мэтай паведаміць, у тым ліку ананімна, аб любых інцыдэнтах, якія можна разглядаць як складнікі злачынства, вызначаныя ў адпаведнасці з дадзенай Канвенцыяй.

Канвенцыя ААН ПА ПРАВАХ ІНВАЛІДАЎ з 13 снежня 2006 – 61/06 Convention on the Rights of Persons with Disabilities г (A/RES/61/106). Польшча падпісала Канвенцыю ў сакавіку 2007 года.

Артыкул 9 Даступнасць
1. Каб надзяліць інвалідаў магчымасцю весці незалежны лад жыцця і ўсебакова ўдзельнічаць ва ўсіх яго аспектах, дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць належныя меры для забеспячэння інвалідам доступу , на прынцыпах роўнасці з іншымі , да фізічнага асяроддзя , транспарту , інфармацыі і камунікацыі , у тым ліку да тэхналогій інфармацыйных і камунікацыйных сыстэмаў , а таксама да іншых аб'ектаў і паслугаў , даступным для насельніцтва як у гарадскіх , так і ў сельскіх раёнах. Гэтыя меры ўключаюць выяўленне і ўхіленне ад перашкодаў і бар'ераў , якія замінаюць даступнасці і павінны распаўсюджвацца , у прыватнасці : ( ... )
а) на інфармацыйныя , камунікацыйныя і іншыя паслугі , у тым ліку на электронныя паслугі і аварыйна -выратавальныя службы.
2 . Дзяржавы-ўдзельніцы таксама прымаюць належныя меры для : ( ... )
б) забяспечвання таго , каб прыватныя ўставы , якія прапануюць абсталяванні і паслугі , былі даступныя для насельніцтва , улічвалі ўсе аспекты даступнасці для інвалідаў.

Артыкул 21 Свабода выказвання меркавання і перакананняў і доступ да інфармацыі
Дзяржавы-ўдзельніцы прымаюць усе адпаведныя меры для забеспячэння таго, каб інваліды маглі карыстацца правам на свабоду выказвання меркаванняў і перакананняў, уключаючы свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі нароўні з іншымі, карыстаючыся ўсімі нормамі камунікацыі ў адпаведнасці з вызначанай



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

дэфініцыяй ў арт. 2 гэтай Канвенцыі, у прыватнасці: (...)
a) забеспячэнне інвалідаў інфармацыяй, прызначанай для шырокага колу людзей ў даступных фарматах і з выкарыстаннем тэхналогій, якія ўлічваюць розныя формы інваліднасці, своечасова і без якіх-небудзь дадатковых выдаткаў, (...)
в) заклікаючы прыватныя установы, якія прадастаўляюць паслугі для шырокай публікі, у тым ліку ў Інтэрнэце, да прадастаўлення інфармацыі і паслугаў ў даступнай і прымальнай форме для інвалідаў;

**Анэта Пежхала-Толяк**
Удзельніца ўраду Таварыства Сеціва Сацыяльнага Watchdog Польшча
www.siecobywatelska.pl; www.watchdogpoland.pl
Трэнер пазаўрадавай арганізацыі, якая займаецца пытаннямі грамадзянскіх правоў, асабліва правам на доступ да публічнай інфармацыі, права на веды і ў тым даступнасці інфармацыі. Яна таксама праводзіць навучанне ў галіне кіравання праектамі, ўвядзення сацыяльных змяненняў, стварэння кааліцый, грамадзянскага бюджэту як элементу дэмакратыі ўдзелу.
Кантакт
e-mail: aneta.pierzchala@siecobywatelska.pl

*Публікацыя выражае толькі погляды аўтара і не можа быць зідэнтыфікаванай з афіцыйным становішчам Міністэрства Замежных Справаў Рэспублікі Польшчы.*



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.